**УДК 821.161.3**

# ВОБРАЗЫ СЯРЭДНЯВЕЧЧА І РЭНЕСАНСУ Ў РАМАНЕ У. КАРАТКЕВІЧА «ХРЫСТОС ПРЫЗЯМЛІЎСЯ Ў ГАРОДНІ»

***М.С. ЛАППО***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***
***job.medialinks@gmail.com***

*Вобраз гістарычнага часу, створаны У. Караткевічам у рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», у артыкуле разглядаецца ў кантэксце трансфармацый уяўленняў пра Сярэднявечча і Рэнесанс у сучаснай гістарыяграфіі. У першай частцы работы падрабязна аналізуюцца вобразы Сярэднявечча і Рэнесансу ў рамане, прыводзяцца адпаведныя звесткі з біяграфіі аўтара, які дзяліўся сваімі творчымі задумамі ў ліставанні і эсэ. Даюцца спасылкі на гісторыка-культурныя работы, у якіх Сярэднявечча і Рэнесанс апісваюцца такім жа чынам, як і ў творы (даследаванні У. Эка, А. Гурэвіча, Дз. Ліхачова). Другая частка артыкула прысвечана сучаснай трансфармацыі ўяўленняў пра Сярэднявечча і Рэнесанс у навуцы і грамадскай свядомасці, на якую звяртаюць увагу даследчыкі Г. Косікаў і Т. Кашамчук, а таксама неадпаведнасці вобразаў твора сённяшнім уяўленням пра рэчаіснасць XVI ст. Выяўляецца сувязь вобразаў, створаных пісьменнікам, з гістарыяграфіяй і грамадска-палітычнай думкай 1960-х гг.*

***Ключавыя словы:*** *У. Караткевіч, раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», Сярэднявечча, Рэнесанс.*

**Уводзіны.** Дзеянне рамана У. Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» адносіцца да пачатку XVI ст. Так, у рэцэнзіі М. Улашчыка адзначаецца: «настоящая работа … посвящена событиям, происходившим в Западной Белоруссии в конце 30-х гг. XVI ст.» [1]. Гэты час прадстаўлены як Позняе Сярэднявечча, якому на змену заступае Рэнесанс. Перад чытачом разгортваецца супрацьпастаўленне эпох: на змену цёмным, цемрашальскім сярэднім вякам прыходзяць новы час, новая свядомасць. Такое ўяўленне пра Сярэднявечча і Рэнесанс трывала замацавалася ў грамадскай свядомасці – праз школьныя падручнікі, сродкі масавай інфармацыі і творы мастацтва. Аднак сённяшняя медыевістыка сцвярджае іншы погляд на згаданыя эпохі: Сярэднявечча было не толькі «цёмным», а Рэнесанс – не толькі сцвярджаў гуманістычныя ідэалы. З улікам гэтай асаблівасці раман мусіць успрымацца і сённяшнімі чытачамі.

Мэтай дадзенага артыкула не з’яўляецца папракнуць У. Караткевіча у адступленні ад гістарычнай праўды: у сваёй працы пісьменнік абапіраўся на гістарычныя даследаванні і імкнуўся праўдзіва ўзнавіць эпоху. Мэта – звярнуць увагу, што творца падаваў звесткі ў святле сутыкнення дзвюх супрацьлеглых эпох і ідэалогій – састарэлай, антычалавечнай і новай, прагрэсіўнай; і што гэтая асаблівасць можа быць абумоўлена тагачаснай ідэалогіяй і тэндэнцыямі ў гуманітарнай навуцы. Такім чынам, задачы работы – дэталёва прааналізаваць вобраз гістарычнага часу ў рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», абапіраючыся на тэкст твора, біяграфію аўтара і культуралагічныя даследаванні; разгледзець названы вобраз у кантэксце сённяшніх гістарыяграфічных даследаванняў; паспрабаваць асэнсаваць, чаму Сярэднявечча і Рэнесанс прадстаўлены ў творы як канфліктуючыя і ідэалагічна несумяшчальныя эпохі.

**Прастора і чалавек у рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».** Эпохі Сярэднявечча і Рэнесансу паказаны ў творы на ўзроўні апісанняў побыту, арганізацыі прасторы, палітычнага ладу, таксама яны маюць ацэначныя аўтарскія характарыстыкі. Нягледзячы на тое, што раман з’яўляецца мастацкім творам і не прэтэндуе на навуковую дакладнасць, пісьменнік грунтоўна рыхтаваўся да яго напісання і вывучаў адпаведныя матэрыялы, каб праўдзіва ўзнавіць асноўныя рысы паказаных эпох. Па сцверджанні літаратуразнаўцы А. Русецкага, «у беларускай літаратуры не знойдзеш іншага твора, які так аб’ектыўна, так шматпланава адлюстраваў бы жыццё беларусаў у сярэднія вякі, як раман “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” У. Караткевіча» [2, с. 102].

Л. Прашковіч у артыкуле «Беларускае Сярэднявечча ў кантэксце рамана У. Караткевіча “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”» звярнула ўвагу, што вялікая роля ў стварэнні вобраза Сярэднявечча ў рамане належыць этнаграфічна-побытаваму кампаненту [3, с. 53]. У творы падрабязна апісваюцца гродзенскі замак, Машкаўскі манастыр, тагачасная зброя, вогнішчы інквізіцыі, рытуалы правядзення суда рымска-каталіцкай царквой, паказаны адзенне, ежа, звычкі самых розных слаёў насельніцтва.

Раман адлюстроўвае такую рысу сярэднявечнай эпохі, як моцная знітаванасць царкоўнага і грамадскага жыцця. У руках служак царквы, паводле твора, сканцэнтраваная ўся ўлада над звычайным чалавекам, а рэлігійнае вучэнне ператвараецца ў ідэалогію, з дапамогай якой арганізаванае грамадскае жыццё. Сярэднявечча характарызуецца наступным чынам: «пакольки святая царква ў тыя змрочныя часы лічыла, што даносу аднаго чалавека верыць нельга…» [4, с. 149], «Яны былі проста дзеці свайго часу, няшчаснага, хворага, гнойнага, сагнутага, калі чалавек быў амаль жывёлай і толькі сям-там выбіваліся наверх парасткі скарлючанага, але ўпартага і моцнага жыцця» [4, с. 25].

У процівагу Сярэднявеччу Рэнесанс – час станаўлення «новага чалавека», больш дасканалага: «Цёмныя і брудныя, нават фізічна, яны не думалі, што плаванне Калумба і выданне Скарынам Бібліі на зразумелай мове – ёсць два ўдары з серыі смяротных udaраў, якія наносіць іхняй догме новы Чалавек. Але інстынктыўна яны адчувалі, што гэта в а р о ж а, што гэта баламуціць, непакоіць, што гэта асвятляе бязлітасным і смертаносным святлом тую ўтульную і цёмную гнойную жыжку, у якой яны кішэлі» [4, с. 25]. У супрацьпастаўленні Сярэднявечча і Рэнесансу аўтар паказвае драматызм гістарычнага адрэзку ў беларускай мінуўшчыне, калі ў непрымірымых супярэчнасцях сутыкнуліся застарэла-ваяўнічая схаластычная дагматыка, што выспела на прынцыпах сацыяльнай няроўнасці, фізічнага і духоўнага здзеку з чалавека, і ідэі гуманізму, асветы, сацыяльнай роўнасці, рэлігійнай верацярпімасці.

Першыя раздзелы рамана У. Караткевіча поўняцца тыповымі для Сярэднявечча вобразамі-сімваламі, якія прадвяшчаюць трагічныя падзеі. Сярэднявечныя летапісцы-наратары апісваюць таямнічыя відзяжы ў небе: «Плылі ў небе караблі пад крывавымі ветразямі», «І ўставалі ў небе гарады, так буйна, што жыхароў можна было пазнаць у твар, і адзін пазнаў у гэтым д'ябальскім горадзе сябра, а за гэта яго звалаклі ў гарадскую цямніцу» [4, с. 12]. Галоўным сімвалам становіцца з'яўленне цмока, у вачах якога «было нейкае страшнае прароцтва»: «За адну ноч на водмелях тых яшчураў, тых цмокаў знайшлі сорак, да палова таго хісталася на фалях, як плаваючыя выспы <…> А яшчэ праз ноч усплыў самы вялікі. Адзін. … Каб таго дзікага і страхавобразнага звера ўбачыць» [4, с. 10]. Названыя вобразы-сімвалы адпавядаюць уяўленням навукоўцаў пра забабоны сярэднявечнай эпохі. У. Эка ў кнізе «Гісторыя вычварэнства» адзначае, што «класічны свет быў вельмі чуйны да розных цудаў, якія ўспрымаліся як прадвеснікі немінучых бедаў. Мяркуючы па Кнізе цудаў Юлія Абсеквенса (у IV ст. н.э. ён апісаў усе цудоўныя падзеі, якія адбыліся ў Рыме за папярэднія гады), гэта былі такія нябачаныя з'явы, як крывавыя дажджы, трывожныя падзеі, агнявыя сполахі ў небе, нараджэнне вырадкаў, двухполых дзяцей» [5, с. 107]. Падобныя трывожныя сімвалы-папярэджанні апісваюцца і ў рамане У. Караткевіча: «І ад жаху, а можа, і па волі божай, які ўсё гэта наслаў, людзі ў той год нядужалі. І пацелі ўначы, і ў грудзях іхніх ціснула і раўло, а ў некаторых валасы лезлі. І надзіва мала ў той год нарадзілася дзяцей, можа, таму, што быў голад і пошасць, а можа, па волі божай, каб не пакутавалі бязвінныя» [4, с. 10]. Трывожныя сімвалы становяцца прадвеснікамі галоднага года і, як вынік, – пратэстных сялянскіх выступленняў. Акрамя гэтага, названыя сімвалы паказваюць свядомасць сярэднявечнага чалавека (у першым раздзеле твора дзівацтвы апісваюцца ад імя летапісца Андроніка Лагафіла) як уразлівую і напоўненую эсхаталагічнымі чаканнямі свядомасць, у якой уяўленні пра рацыянальнае і ірацыянальнае суіснуюць нароўні.

У аўтарскіх каментарах пісьменнік прыводзіць некаторыя характарыстыкі Сярэднявечча навукова-папулярнага характару – каб чытач займеў больш яскравае ўяўленне пра апісваемы час. Так, напрыклад, калі Юрась Братчык захоплена апісвае пейзаж, а Жаба і Балвановіч нават не могуць зразумець, пра што ён гаворыць, аўтар удакладняе: «Уся гісторыя старажытнасці і сярэдніх вякоў калі і ведала захапленне прыродай, дык толькі фізічна. Захапляцца прыродаю на паперы ці на словах лічылася справай падазронай, дарэмнай і пустой … на працягу дваццаці сямі стагоддзяў еўрапейскай літаратуры мы не сустрэнем у ёй нават такой колькасці пейзажаў, колькі іх, скажам, у “Вайне і міры”» [4, с. 101]. Радаснае захапленне прыродай, любаванне яе прыгажосцю становяцца ў творы рысамі рэнесанснага чалавека, які можа радавацца жыццю.

Сацыяльна-гістарычны час, паказаны ў творы, – неадназначны і супярэчлівы. А. Мальдзіс у эсэ «Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча» піша, што ў рамане перад чытачом «паўстае беларускае сярэдневякоўе з яго рэзкімі сацыяльнымі кантрастамі, барацьбой за ўладу, інквізіцыяй, засіллем схаластыкі, праз якую квола прабіваюцца парасткі Рэнесансу і гуманізму. Паміраюць ад голаду сяляне, а побач па дарозе цягнуцца вазы, гружаныя збожжам, якое па Нёмане будуць сплаўляць у Заходнюю Еўропу <…> Трагічнае, жахлівае, пачварнае суседнічае з будзённым, смешным, ідылічным» [6, с. 99]. Асабліва акцэнтуецца ўвага на такіх адмоўных з'явах, як абскурантызм рэлігіі, раскоша і маральная распуста царкоўных служкаў, кантраст багацця кіруючай вярхушкі і беднасці, голаду, бяспраўя гарадскіх і сялянскіх мас, фізічнае вынішчэнне непакорных, на схаластыцы як сярэднявечнай філасофіі, якая стварыла сістэму штучных, чыста фармальных і лагічных аргументаў для тэарэтычнага абгрунтавання дагматаў царквы. Найбольш абсурднымі сцэнамі бяспраўнасці царкоўнікаў як носьбітаў улады з'яўляюцца гратэскныя эпізоды пакарання званоў і анафемы і выгнання з горада мышэй, а таксама продаж індульгенцый (раздзел XIX) і дзейнасць інквізіцыі (раздзел XXIV).

У раздзеле «Голад, і пошасць, і мор» звяртаецца ўвага на рэзкія сацыяльныя кантрасты: вышэйшае духавенства Гародні, «у рабізне залатых карбовак, эмалі, золата, рубінаў, ажурных накладак» [7, с. 16], прыязджае ў вёску, дзе хаты – «падобныя на гнойныя суметы» [7, с. 17]. Такі гіпербалічна-антытэтычны паказ сацыяльнай няроўнасці мае даўнюю традыцыю ў беларускай літаратуры, якая асабліва яскрава выявілася ў творчасці Ф. Багушэвіча і Я. Купалы. Карціна, створаная У. Караткевічам, напрыклад, перагукаецца з паказам жыцця беларускай вёскі XIX ст. у вершы Ф. Багушэвіча «Бог не роўна дзеле»: «Адзін ходзе ў саеце, у золаце з плеч да ног, а другому, каб прыкрыцца хоць анучай – велькі труд <…> Адзін мае хатаў многа, а вялікіх – касцёл моў <…> У другога ў сцяне дзюры, вецер ходзе, дым і снег <…> Аднаму дзясяткі служак зарабляюць сотні сот <…> другі ж сам, аж за дзясятак працуючы, лье свой пот» [8, с. 43–44].

У сярэднявечнай культуры час разглядаўся як адлюстраванне вечнасці, прычым уяўленне пра яго мела пераважна эсхаталагічны характар: час пачынаецца з акту тварэння і завяршаецца «другім прышэсцем» (што і назіраецца ў рамане) [9, с. 108]. Аднак пачынаючы з Рэнесансу ў культуры і навуцы зацвярджаецца эвалюцыянісцкая тэорыя часу: асновай яго руху становяцца прасторавыя падзеі. Час разумеецца ўжо не як застылая вечнасць, а як сіла, «што рухаецца і рэалізуецца ў кожнай імгненнай сітуацыі» [10], – менавіта такое адчуванне часу маюць станоўчыя героі твора, носьбіты рэнесанснага мыслення – Юрась Братчык, некаторыя гараджане (разьбяр Кляонік, каваль Кірык Вястун, мечнік Турай і яго сын Марка, залатых спраў майстар Ціхон Вус), былы прыёр францысканскага кляштара брат Альбін з Арэтвы, а ў ранейшым жыцці Альбін-Рагвал-Алёйза Крыштофіч з Дубатыння, юнак Кашпар Бекеш, асуджаны, як і Крыштофіч, членамі Святога трыбунала. Гэтыя героі, паводле рамана, стваралі славу гродзенскай зямлі. Прычым калі апошнія – людзі адукаваныя і свядома змагаюцца з рымска-каталіцкай навалай, то словы, выказаныя Кляонікам, – выяўленне народнага вальнадумства, непрымання народам рэлігійнага падману: « – Няма і не трэба лепшых і горшых у дзяржаве, царкве і касцёле, і ў багацці. <…> Не павінна быць розніцы ў законе, розніцы між каралём і народам, між тым, хто царуе, і тым, хто арэ, між плебеем і шляхціцам, а павінна быць усё для ўсіх, агульнае і роўнае, і воля павінна быць і на зямлі, і на небе, а веруй, як хто хоча» [4, с. 52–53].

Трэба адзначыць, што эпоха Адраджэння была вельмі натхняльнай для У. Караткевіча. Яшчэ ў 1956 г., за дзесяць год да стварэння рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», у лісце да М. Танка пісьменнік выказваў сваё захапленне паэмай «Люцыян Таполя» і сярод іншага пісаў: «эпоха Рэнесансу на Беларусі. Здарылася дзіўнае: маленькі агеньчык засвяціўся ў цемры, дух чалавечы імкнуўся вызваліцца да сонца і жыцця», «І ў скульптуры быў Рэнесанс. Замест драўляных шкілетаў, абцягнутых драўлянаю скурай, з'яўляецца пад разцом разьбяра паўнакроўны жывы чалавек», «Я яшчэ таму думаю, што гэта эпоха добрая, што на яе прыкладзе будучы пісьменнік можа даць добрага стусана рэлігіі, прыгнёту, фанатызму і мілітарызму, пустацвету і забабонам, ханжаству, – усім аматарам крычаць пра залаты век, гальванізаваць труп мінулага, прырабляць новыя ручкі да скініі, шукаць каўчэгі з новымі мошчамі» [11, с. 604–605].

**Суадносіны мастацкіх вобразаў рамана і гістарычных даследаванняў.** Вобразы Сярэднявечча і Рэнесансу з'яўляюцца пэўнымі сацыякультурнымі канцэптамі – уяўленнямі, замацаванымі ў грамадскім жыцці, агульнымі для вялікай колькасці людзей. Па азначэнні А.Я. Гурэвіча, «канцэпт сярэднявечча ў сучаснай культурнай свядомасці ўключае ў сябе часавыя межы, якія яго вызначаюць, ідэалогію і спецыфічныя "элементы" мастацкай карціны свету. Сярэднявечча тлумачыцца як паняцце не столькі храналагічнае ("культурны перыяд"), колькі змястоўнае (і амбівалентнае: адсталае, з аднаго боку, – рамантычнае, маральна цэласнае, з іншага)» [12, с. 8]. Як адзначае гісторык Г. Сагановіч, паняцце «сярэднія вякі» з моманту з'яўлення мела пеяратыўнае значэнне: гуманісты ўкладалі ў яго ўласнае адмоўнае стаўленне да папярэдняй эпохі – на іх думку, часу невуцтва і застою, у адрозненне ад іх часу, названага Адраджэннем. «Ужо Петрарка ахрысціў Сярэднявечча "цёмным", "варварскім"» [13].

Аднак з цягам часу сэнсавае напаўненне пэўных канцэптаў змяняецца – асабліва ў гуманітарнай навуцы, якая часта займаецца "пераапісаннем" існуючых аб'ектаў з улікам кантэксту эпохі. Сёння Сярэднявечча ўспрымаецца гісторыкамі як «нармальная», паўнавартасная эпоха ў развіцці чалавечай цывілізацыі, якая ведала напружаныя сацыяльныя і светапоглядныя супярэчнасці і канфлікты, барацьбу кансерватыўных і наватарскіх тэндэнцый, царкоўны дагматызм, фанатызм, ерасі, рэлігійнае вольнадумства, народныя рухі і інш. Разам з тым яна дала свету выбітных мысляроў, паэтаў, мастакоў, выпрацавала самастойныя і арыгінальныя ўяўленні пра ісціну, дабро і прыгажосць, абгрунтавала каштоўнасці, якія сцвярджалі далучанасць індывіда да звышасабістых ідэалаў, да ўсёй светабудовы ў цэлым. Гэтая каштоўнасная мадэль дагэтуль «спрачаецца» з індывідуалістычнымі каштоўнасцямі новаеўрапейскай цывілізацыі, якая ўзвышае асобнага індывіда. Што тычыцца Рэнесансу, у сучаснай медыевістыцы сцвярджаецца думка, што названая эпоха не была цэласнай, «сцэменатаванай» гуманістычнымі ідэаламі, а ўяўляла сабой дастаткова разнародны час, калі часова меў месца культурны рух Адраджэння. Рэнесанс быў прасякнуты мноствам рознаскіраваных тэндэнцый, якія часта не мелі з гуманізмам нічога агульнага ці нават крытыкавалі яго. Пра негатыўныя праявы эпохі расказвае А.Ф. Лосеў у раздзеле «Адваротны бок тытанізму» кнігі «Эстэтыка Рэнесансу» (1978). Па сцверджанні некаторых медыевістаў, уяўленні пра суадносіны Сярэднявечча і Рэнесансу як супрацьстаянне двух светапоглядных маналітаў («новага»/«старога», «жывога»/«аджыўшага») у пэўнай ступені з'яўляюцца «легендай», створанай асветнікамі XVIII ст. і ліберальна-буржуазнымі гісторыкамі XIX ст. [14].

Такім чынам, сёння складана вызначыць асноўныя, вызначальныя рысы Сярэднявечча або Рэнесансу, адназначны набор сістэмаўтваральных элементаў. Вобразы гэтых эпох (як і іншых гістарычных перыядаў, пра якія мы маем уяўленне) з'яўляюцца пэўнымі канструктамі, што ствараюцца наноў кожнай эпохай у залежнасці ад яе ўласных праблем. Таму дыскусію варта пераносіць у іншую плоскасць – не шукаць вызначальныя характарыстыкі эпохі, а разглядаць сукупнасць яе вобразаў у розныя часы.

Змяненне сэнсавага напаўнення паняццяў Сярэднявечча і Рэнесанс пацягнула за сабой і пытанне пра тое, ці быў нейкі выразны пераход ад адной эпохі да другой. Што тычыцца тэрыторыі Беларусі, Г. Сагановіч адзначае, што тут не адбылося рэзкай змены: «Усё тое, што было зместам Сярэднявечча як эпохі,

у Беларусі ад XVI да XVII ст. толькі нарастае. У прынцыпе тут і ў XVIII ст. грамадства заставалася ва ўладзе традыцыі, той самай "старыны", да якой так настойліва апелявала і якім жыло беларускае мяшчанства далёкага XVI ст. Гэта значыць, практычна ўсім членам грамадста ў той ці іншай ступені была ўласціва так званая "народная культура" Сярэднявечча – комплекс уяўленняў пра свет, разумовых установак і стэрэатыпаў паводзін, прасякнутых народнай рэлігійнасцю і архаізмам» [15].

Хацелася б выказаць гіпотэзу, што ў 1960-я гг. Сярэднявечча і Рэнесанс сапраўды ўяўляліся даследчыкам як эпоха невуцтва, на змену якой прыйшоў час росквіту і дасягненняў. У прыватнасці, такое апісанне можна ўбачыць у працах М.М. Бахціна, якія выходзілі ў тыя ж гады, што і раманы У. Караткевіча – 1960–1980-я. Як адзначае Т. Кашамчук, «міф пра цемрашальства Сярэднявечча (цалкам савецкі) Бахцін у поўнай меры падтрымлівае і творча развівае, не выпадкова некаторыя еўрапейскія крытыкі прама гавораць, што Бахцін нічога не зразумеў ні ў Сярэднявеччы, ні ў Адраджэнні. Так, Бахцін – і для яго гэта галоўнае – прапаведуе ўваскрэсенне з гэтай, сярэднявечнай, цемры – да новага рэальнага жыцця праз далучэнне да сферы "піцця, палавога жыцця і далучаных да іх цялесных праяў" ТФР, 344» [16, с. 154].

Можна меркаваць, што пры напісанні рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» У. Караткевіч апісваў Сярэднявечча і Рэнесанс, абапіраючыся на дасягненні і набытке тагачаснай гістарыяграфіі, у якой не маглі не знайсці адлюстраванне падзеі XX ст. – рэвалюцыя і класавая барацьба, Першая і Другая сусветныя войны. Супрацьстаянне царкоўных служак і простага народа, барацьба двух лагераў (класаў) цалкам упісваюцца ў гэтую гістарычную парадыгму. Яшчэ адной акалічнасцю, чаму пісьменнік выбраў выразнае супрацьстаянне эпох, можа быць яго арыентацыя на такі ўзор літаратуры, як так званы "вальтэрскотаўскі» гістарычны раман, дзе героі выразна падзелены на станоўчых і адмоўных, эпохі апісваюцца ў рамантычным духу, а для герояў уласцівыя высокія ідэалы.

**Заключэнне.** Такім чынам, у рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» паказаны сацыяльна-гістарычны час пераходнай эпохі ад Сярэднявечча да Рэнесансу, напоўнены супярэчнасцямі і кантрастамі. Паводле аўтарскай канцэпцыі, у гэты перыяд адбываліся змены ў чалавечай свядомасці, у выніку якіх прыгнечаны народ пачаў усведамляць сваю годнасць. Сярэднявечча і Рэнесанс ўвасабляюць антанімічныя каштоўнасці і характарызуюць прынцыпова розныя мадэлі чалавечага існавання: першая эпоха выступае ў якасці сістэмы, якая цалкам «зжыла» сябе, другая атаясамліваецца з прагрэсам і верай у чалавечыя магчымасці.

Твор адлюстроўвае многія найбольш тыповыя асаблівасці перыяду пачатку XVI ст., што цалкам суадносіцца са сведчаннямі такіх даследчыкаў, як У. Эка, А.Я. Гурэвіч. У прыватнасці, раман паказвае знітаванасць царкоўнага і грамадскага жыцця, эсхаталагічнасць сярэднявечнага ўспрымання часу. Акрамя гэтага, пісьменнікам па-мастацку пераканаўча «ўваскрашаюцца» гістарычныя рэаліі – асаблівасці тагачаснага вясковага і гарадскога побыту (рынкі, жылыя дамы); сацыяльныя феномены, тыповыя для сярэднявечча (продаж індульгенцый, дзейнасць інквізіцыі); згадваюцца рэальныя гістарычныя асобы (Кашпар Бекеш).

Сёння канцэпты Сярэднявечча і Рэнесансу – прынамсі, у гістарыяграфіі – зазналі трансфармацыю: даследчыкі больш не характарызуюць названыя эпохі як цэласныя і маналітныя, не надзяляюць іх наборам статычных прыкмет. Можна меркаваць, што выбар У. Караткевічам такой мадэлі апісання згаданых эпох, пры якой яны прэзентаваны як супрацьпастаўленыя адна адной, можа быць абумоўлены рознымі фактарамі: панаваннем такога погляду ў тагачаснай гуманітарнай навуцы (што пацвярджае такі ж пункт гледжання ў работах М.М. Бахціна), уплывам на тагачасную гуманітарную навуку, і гісторыю ў тым ліку, грамадска-палітычных падзей XX ст. – войн, рэвалюцыі і класавай барацьбы, уяўленні пра якія праецыраваліся і на ранейшыя гістарычныя перыяды; арыентацыяй пісьменніка на жанр гістарычнага рамана "вальтэрскотаўскага" тыпу, у якім сутыкаюцца два супрацьлеглыя варожыя лагеры, станоўчыя і адмоўныя героі. Нарэшце, такі выбар можна патлумачыць і проста асабістымі прыхільнасцямі пісьменніка, занатаванымі ў ліставанні з Максімам Танкам, або сукупнасцю ўсіх названых фактараў.

ЛІТАРАТУРА


1. Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі. – Ф. 11. Воп. 2. Адз. зах. 1099.
2. Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць : нататкі літаратурнай творчасці / А. Русецкі. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 300 с.
3. Прашковіч, Л.І. Беларускае Сярэднявечча ў кантэксце рамана У. Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» / Л.І. Прашковіч // Вобразна-эстэтычны аспект нацыянальнай мастацкай свядомасці : зб. навук. арт. / Мазыр. дзярж. пед. ун-т. – Мазыр, 2009. – Вып. 5. – С. 45–55.
4. Караткевіч, У. Хрыстос прызямліўся ў Гародні / У. Караткевіч // Зб.тв. : у 8 т. – Мінск : Маст. літ., 1990. – Т. 6. – 494 с.
5. Эко, У. История уродства / У. Эко. – М. : СЛОВО/SLOVO, 2007. – 456 с.
6. Мальдзіс, А. Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск : Літ. і маст., 2010. – 206 с.
7. Караткевіч, У. Збор твораў : у 25 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 2012–… – Т. 9 : Хрыстос прызямліўся ў Гародні: Евангелле ад Іуды. – 2015. – 733 с.
8. Багушэвіч, Ф. Творы / Ф. Багушэвіч. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 206 с.

9. Гуревич, А.Я. Категории средневековой культуры / А.Я. Гуревич. – М. : Искусство, 1984. – 350 с.
10. Лихачев, Д.С. Поэтика древнерусской литературы / Д.С. Лихачев. – М. : Наука, 1979. – 352 с.
11. Караткевіч, У. Выбраныя творы / У. Караткевіч. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2005. – 669 с.
12. Гуревич, А.Я. Средневековый мир: культура безмолвствующего большинства / А.Я. Гуревич. – М. : Искусство, 1990. – 396 с.
13. Сагановіч, Г. У пошуках Сярэднявечча [Электронны рэсурс] / Г. Сагановіч // Беларус. гіст. агляд. – 1997. – Т. 4, сш. 1/2. – Рэжым доступу: http://www.data.minsk.by/bhr/bel/6-7/67_1.html. – Дата доступу: 15.08.2018.
14. Косиков, Г.К. Средние века и Ренессанс. Теоретические проблемы / Г.К. Косиков // Зарубежная литература второго тысячелетия. 1000–2000 : учеб. пособие / под ред. Л.Г. Андреева. – М. : Высш. шк., 2001. – С. 8–39.
15. Сагановіч, Г. Перыядызацыя беларускай гісторыі [Электронны рэсурс] / Г. Сагановіч // Жыве Беларусь : б-ка гіст. арт. – Рэжым доступу: http://jivebelarus.net/history/gistografia/periodisation-of-belarusian-history.html. – Дата доступу: 15.08.2018.
16. Кошемчук, Т.А. О Бахтине, карнавализации, Рабле и Достоевском / Т.А. Кошемчук // Верхневолжский филологический вестник. – 2015. – № 2. – С. 151–156.

*Пастуniў 23.04.2020*

## IMAGES OF MIDDLE AGES AND RENAISSANCE IN THE NOVEL “CHRIST LANDED IN HRODNA” BY U. KARATKIEVICH

***M. LAPPO***

*The article discusses the historical time image created by U. Karatkievich in the novel "Christ landed in Hrodna" in the context of the contemporary historiographic ideas about the Middle Ages and the Renaissance. In the first part of the work the images of the Middle Ages and the Renaissance in the novel are analyzed in detail, the relevant information from the author’s biography is provided. The historical and cultural works in which the Middle Ages and the Renaissance are described in the same way as in the novel are mentioned (studies by U. Eco, A. Gurevich and D. Likhachev). The second part of the article is devoted to the contemporary transformation of the Middle Ages and the Renaissance representations (in science and public consciousness), on which such researchers as G. Kosikov and T. Koshemchuk point out. In addition, attention is drawn to the discrepancy between these representations and historical time described in the novel. The author of the article points out to the connection between the images created by the writer and the 60s of the XXth century historiography and socio-political thought.*

***Keywords:*** *Uladzimir Karatkievich, “Christ landed in Hrodna”, Middle Ages, Renaissance.*